УДК 947.6.01

Д. В. Віцько, аспірант

# ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА 1696–1702 гг. У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

The article is dedicated to the history of the civil war of 1696–1702 in the Grand Duchy of Lithuania which is considered in the correlation with the problem of the reformation of the state-political arrangement of that country. After the death of the king and grand duke Ian Sabieski Lithuanian nobility rebelled against the hegemony of the magnate house of Sapiegas in the Duchy. With the support of the new king August II they managed to achieve the weakening of Sapiega's power and then to defeat them in battle of Alkieniki in 1700. The nobility fought with the slogan of the equalization of their rights with those of the Polish nobility. However under the influence of the co-operation with August II their program evolved towards absolutism, which found its expression in the Vilnia's decree of 1701.

Грамадзянская вайна 1696–1702 гг. у Вялікім княстве Літоўскім, у якую вылілася супрацьстаянне паміж групоўкай Сапегаў і шляхецкай апазіцыяй, па сённяшні дзень застаецца па-за ўвагай беларускіх гісторыкаў. Адсутнічаюць манаграфіі і навуковыя артыкулы, прысвечаныя дадзенай праблематыцы. Увогуле гістарыяграфія грамадзянскай вайны налічвае ўсяго некалькі артыкулаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца польскія гісторыкі К. Піварскі [23], Т. Васілеўскі [29], Л. Павідай. Сітуацыю ў ВКЛ непасрэдна напярэдадні ўзброенага канфлікта даследаваў А. Рахуба [24]. У апошні час значны ўклад у вывучэнне палітычных праграм варагуючых груповак унёс Я. Сташэўскі [26], якому часткова ўдалося праліць святло на гісторыю прыняцця т. зв. «Віленскай пастановы». Ускосна падзеі вайны закранаюцца ў працах У. Канапчыньскага [16], Ю. Шуйскага [27], Я. Вайтасіка [30], а таксама расійскага савецкага гісторыка У. Каралюка [5], які разглядае дадзены канфлікт як каталізатар уступлення ВКЛ і Рэчы Паспалітай у Паўночную вайну. З літоўскіх гісторыкаў даследаваннем грамадзянскай вайны ў Вялікім княстве займаецца Г. Слесарунас [10].

У другой палове XVII ст. ВКЛ, як і ўся цэлым Рэч Паспалітая, знаходзілася ў стане перманентнага палітычнага крызісу. Пастаянныя зрывы соймаў побач з аслабленнем каралеўска-вялікакняскай улады вялі да канцэнтрацыі ўладных паўнамоцтваў у руках асобных магнатаў. У выніку на фоне агульнага паралiча цэнтральнай улады ў дзяржаве назіралася абвастрэнне барацьбы паміж рознымі магнацкімі групоўкамі. «Залатыя шляхецкія вольнасці» на справе такімі не з'яўляліся, паколькі дробная і сярэдняя шляхта, цалкам залежная ад магнатаў, не ўяўляла самастойнай палітычнай сілы; клопат пра іх захаванне служыў толькі зручным прыкрыццём для кансервацыі адсталага дзяржаўна-палітычнага ладу. Цяжкія наступствы войнаў сярэдзіны XVII ст., пусты скарб, слабое войска, колькасці якога было недастаткова для абароны дзяржавы, – усё гэта надавала крызісу ўсеагульны характар і стварала спрыяльную глебу для знешняга ўмяшальніцтва. На фоне ўмацавання ў еўрапейскіх краінах абсалютысцкіх рэжымаў для Рэчы Паспалітай паўставала рэальная небяспека страты суверэнітэту.

Акрамя таго, унутры федэратыўнай дзяржавы існаваў пэўны антаганізм паміж Вялікім княствам Літоўскім і Каралеўствам Польскім, які ў надзвычайных абставінах (вайны і г. д.) узмацняўся і набываў тэндэнцыю да разрыву уніі, як гэта мела месца, напрыклад, у 1655 г. Па-другое, у Княстве традыцыйна дамінаваў нейкі адзін магнацкі дом, а не некалькі, як гэта было ў Кароне. Аб'ектыўна якраз ён і станавіўся ініцыятарам сепаратысцкіх памкненняў.

З 80-х гг. XVII ст. найвышэйшыя дзяржаўныя пасады ў ВКЛ займалі Сапегі: Казімір Ян Сапега (віленскі ваявода і вялікі гетман з 1683 г.) і яго брат Бенедыкт Павел (падскарбі ВКЛ з 1676 г.) – прадстаўнікі ружанскай галіны роду. Шэраг пасадаў займалі сыны вялікага гетмана Юры Станіслаў (стольнік ВКЛ з 1686 г.), Міхал Францішак (канюшы ВКЛ з 1690 г.), Аляксандр Павел (маршалак ВКЛ з 1698 г.) і сын падскарбія Міхал Язэп (стражнік вялікі літоўскі з 1692 г.). Акрамя таго, некаторыя пасады ў дзяржаўным апараце ВКЛ займалі прадстаўнікі кодыньскай галіны роду: Казімір Уладзіслаў (кашталян, а з 1697 г. – ваявода троцкі) і Уладзіслаў Язафат (крайчы літоўскі, а з 1699 г. – ваявода менскі) [14, p. 76–78]. Такім чынам, на канец XVII ст. пад кантролем прадстаўнікоў роду знаходзілася войска, скарб і тры цэнтральныя ваяводствы.

Улада Сапегаў была падмацавана вялізнымі зямельнымі ўладаннямі – толькі ў ВКЛ ім належала больш за 25,5 тыс. дымоў [9, с. 45] (17 570 з іх – асабіста К. Я. Сапегу [12, p. 35]). Калі ж дадаць сюды т. зв. «нойбургскую спадчыну» – былыя землі слуцкіх Радзівілаў (па розных даных – ад 14 да 16 тыс. дымоў [12, p. 44–45]), за апекуна якіх быў прызнаны вялікі гетман, – то стане відавочна, што па багаццю і ўплывовасці ў ВКЛ Сапегі не мелі сабе роўных. Для параўнання, наступныя па магутнасці Радзівілы мелі каля 12 тыс. дымоў

[12, p. 35], Я. Слушка – менш за 2,5 тыс., Агінскія і Пацеі разам – прыблізна 3 тыс. [9, с. 45]. Зразумела, што ніводзін з гэтых дамоў не мог супрацьстаяць Сапегам у барацьбе за гегемонію ў ВКЛ.

Ян Сабескі, узвышаючы Сапегаў, разлічваў, што тыя будуць больш лаяльныя каралеўскай уладзе, чым іх папярэднікі Пацы. Аднак Сапегі адразу ж перайшлі ў апазіцыю да караля, а ў далейшым сумесна з кароннымі магнатамі сарвалі планы прыжыццёвай элекцыі Якуба, сына Яна Сабескага [16, p. 113, 124]. Імкненне Сапегаў да неабмежаванай улады ў ВКЛ непазбежна ўваходзіла ў супярэчнасць з існаваннем уніі. Паводле сведчання сучаснікаў, К. Я. Сапега планаваў дабіцца аднаўлення незалежнасці ВКЛ, дзе ён сам стаў бы вялікім князем [20, p. 21]. Ян Сабескі ў барацьбе супраць Сапегаў на гэты раз вырашыў не падтрымліваць нейкі адзін магнацкі дом, а пачаў мэтанакіравана ўзвышаць выхадцаў з сярэдняй шляхты (Белазораў, Крышпінаў, Бжастоўскіх, Катовічаў і інш.). Вынікі такой палітыкі пераўзышлі ўсе спадзяванні, але выявілася гэта ўжо пасля смерці караля.

Апошнія гады панавання Яна Сабескага адзначаны для ВКЛ двума ўнутранымі канфліктамі, якія засведчылі, што далейшае ўзрастанне магутнасці Сапегаў будзе сустракаць усё больш рашучы адпор з боку колаў, да тога часу нейтральных. Маецца на ўвазе маёмасная спрэчка Казіміра Яна Сапегі з Каралем Станіславам Радзівілам (падканцлерам, а затым канцлерам ВКЛ) за «нойбургскую спадчыну», якая ў 1695 г. вылілася ва ўзброенае сутыкненне [19, p. 77, 81–82], і канфлікт вялікага гетмана з віленскім біскупам Канстанцінам Бжастоўскім. Прычынай апошняга паслужыла спустошэнне касцёльных зямель кватаруючымі там літоўскімі войскамі. Асаблівага накалу гэта барацьба дасягнула ў 1694 г., калі віленскі біскуп адлучыў ад касцёлу ўвесь род Сапегаў. Канфлікты з каралём, касцёлам і Радзівіламі аблегчылі выступленне антысапяжынскай апазіцыі, якое супала па часе з бескаралеўем пасля смерці Яна Сабескага (17 чэрвеня 1696 г.). Аднак першыя хваляванні ў ВКЛ адбыліся яшчэ да гэтай падзеі, калі ў лютым 1696 г. на Жмудзі супраць Сапегаў выступіла мясцовая шляхта, падбухтораная жмудскім біскупам і каралевай Марыяй Казімірай [14, p. 389].

17 кастрычніка 1696 г. пад Берасцем была ўтворана канфедэрацыя, якая ўяўляла сабой першую спробу арганізаванага ўзброенага выступлення антысапяжынскай апазіцыі. Фармальным повадам яе паслужыла абарона правоў касцёла [13, p. 26]. На чале канфедэратаў стаялі Рыгор Антоні Агінскі (харужы ВКЛ) і Міхал Коцел (кашталян віцебскі), якія ўзбунтавалі частку войска і загітавалі шляхту шэрагу ваяводстваў. Актыўны ўдзел у арганізацыі выступлення прынялі Казімір Пацей (стражнік ВКЛ), браты Андрэй і Ян Крышпіны (віцебскі ваявода і жмудскі біскуп), а таксама каралева-ўдава Марыя Казіміра, ад якой залежала фінансаванне канфедэрацыі [13, p. 28]. Сапегі ўзялі канфедэратаў у аблогу і двойчы спрабавалі штурмаваць іх пазіцыі, пасля чаго перайшлі да блакады Берасця. Урэшце 26 лістапада 1696 г. бакі падпісалі мірнае пагадненне. Фактычна гэта была перамога Сапегаў і паражэнне партыі Сабескіх, якія былі абвінавачаны ў распальванні грамадзянскай вайны ў ВКЛ. Урэшце рэшт Якуб Сабескі ўвогуле адмовіўся ад удзелу ў выбарах. Адпаведна выраслі шансы на атрыманне кароны французскага прынца Франсуа Людовіка дэ Канты, якога падтрымлівалі Сапегі.

Аднак літоўская апазіцыя не збіралася адмаўляцца ад намеру выкарыстаць часы бескаралеўя для рэалізацыі сваіх памкненняў. У гэты ж час яна фармулюе выразна акрэсленую палітычную праграму, якая выразілася ў патрабаванні «каэквацыі», г. зн. ураўнавання правоў літоўскай шляхты з правамі польскай. Асноўныя пункты гэтай праграмы былі фактычна скіраваны супраць Сапегаў і прадугледжвалі: 1) права любога суда судзіць гетмана за злоўжыванні; 2) адабранне збору падаткаў на войска з рук падскарбія і перадачу яго ў рукі спецыяльна прызначаных соймам асобаў; 3) адмену звычая, паводле якога рашэнне трыбуналу ўваходзіла ў сілу толькі пасля таго, як яно будзе замацавана пячаткай вялікага канцлера [25, p. 32–33]. Літоўская шляхта дамаглася таго, што яе патрабаванні былі прыняты на элекцыйным сойме 18 чэрвеня 1697 г. Прыняцце дадзенага дакумента («Прававое ўраўнаванне ... станаў ВКЛ з Каронай Польскай» [28, p. 417–421]) азначала юрыдычную уніфікацыю Вялікага княства з Польшчай на аснове «залатых шляхецкіх вольнасцяў». Акрамя чыста палітычных наступстваў, гэтая уніфікацыя нанесла смяротны ўдар па старабеларускай («рускай») мове, ужыванне якой у справаводстве з гэтага часу забаранялася [28, p. 418]. Выразна шляхецкі характар праграмы садзейнічаў таму, што шэрагі апазіцыі за кароткі час значна выраслі, у асноўным за кошт сярэдняй і дробнай шляхты.

Пазіцыя літоўскай шляхты шмат у чым паўплывала на тое, што каралём і вялікім князем стаў не Франсуа Людовік дэ Канты, які атрымаў абсалютную большасць галасоў на элекцыйным сойме 26–27 чэрвеня 1697 г., а саксонскі курфюрст Фрыдрых Аўгуст, які каранаваўся пад іменем Аўгуста II. Пад паг-

розай новага шляхецкага выступлення, а таксама расійскай інтэрвенцыі (Францыя была звязана з Турцыяй, з якой Расія знаходзілася ў стане вайны) Сапегі адмовіліся аказаць дэ Канты абяцаную ўзброеную падтрымку [30, p. 33], а ў канцы лістапада 1697 г. прызналі ўладу Аўгуста II. Апошні яшчэ да свайго абрання падтрымаў праграму ўраўнавання правоў, чым забяспечыў сабе шматлікіх саюзнікаў у ВКЛ з ліку шляхты. У «pacta conventa» Аўгуста II было ўнесена абяцанне забяспечыць выкананне «кэквацыі» [26, p. 84]. Нічога дзіўнага, што адносіны Сапегаў з Аўгустам II ад самага пачатку складваліся дрэнна. Абсалютысцкія планы новаабранага манарха ніяк не маглі супадаць з імкненнем літоўскіх магнатаў да неабмежаванай улады ў ВКЛ.

Пагадненне Сапегаў з апазіцыяй усё адно пратрывала нядоўга: па ўсёй краіне пачаліся напады шляхты на сапяжынскія ўладанні, а ў Расенях 3 снежня 1697 г. быў разбіты сын вялікага гетмана Юры Станіслаў [14, p. 390]. У пачатку 1698 г. у Ашмянах сабраўся антысапяжынскі з'езд шляхты – справа ішла да канфедэрацыі супраць Сапегаў пад маркай абароны караля. Але сам Аўгуст II збіраўся ваяваць з Турцыяй і таму хацеў дасягнуць міру з усімі групоўкамі ў Рэчы Паспалітай, у тым ліку з Сапегамі. Выдадзены ім яшчэ 27 снежня 1697 г. універсал, які ўтрымліваў заклік да шляхты памірыцца з вялікім гетманам [27, p. 188], прывёў да падпісання 28 студзеня наступнага году адпаведнага мірнага пагаднення. Аднак хутка яно было сарвана – Р. Агінскі ўзбунтаваў значную частку войска і распачаў сапраўдную вайну з сапяжынцамі. Тады кароль загадвае вярнуць адабраныя шляхтай харугвы літоўскага войска назад пад кіра-ванне вялікага гетмана. Аднак гэта не мела ўздзеяння: Агінскі са шляхтай працягвалі нападаць на людзей гетмана, рабаваць іх маёнткі і нават пагражалі Аўгусту II [5, c. 193]. У Беларусі былі разрабаваны і спалены сапяжынскія маёнткі ў Чарэі, Барысаве, Дуброўне, Бярэзіне [21, p. 193]. У сакавіку 1698 г. аўстрыйскі пасол І.Г. Корб, які ехаў праз Беларусь ў Маскву, бачыў у Барысаве людзей, прыбітых за языкі да сценаў дамоў за тое, што адмаўляліся плаціць паборы [3, p. 28]. Але асноўныя баявыя дзеянні ў той час вяліся на Жмудзі і паблізу яе. Шляхта, сабраная ў ваколіцах Панявежа Р. Агінскім, разбіла пад Вялонай адзін з сапяжынскіх аддзелаў і рушыла на Коўна [18, p. 49]. Каб перашкодзіць яе маршу, вялікі гетман выслаў з Гародні частку войска на чале са сваім сынам Юрыем Станіславам. У выніку Р. Агінскі 29 сакавіка 1698 г. быў разбіты пад Коўнам [14, p. 390]. 28 красавіка пад Жыжморамі яго разбіваюць паўторна, на гэты раз другі сын Сапегі, Міхал Францішак. Але няўдачы не паўплывалі на рашучасць шляхецкага правадыра.

Летам 1698 г. канфлікт яшчэ больш абвастрыўся ў сувязі з абраннем Агінскага жмудскім старастам, супраць чаго пратэставалі Сапегі. У канцы чэрвеня жмудскія паслы пагражалі Аўгусту II, што знойдуць сабе іншага гаспадара, калі той не падцвердзіць абранне Агінскага. Гэта была недвухсэнсоўная пагроза разрыву уніі, і Аўгуст II палічыў за лепшае падтрымаць Агінскага. «Кароль-хамелеон», як называе яго У. Канапчыньскі [17, p. 37], вёў складаную гульню на два бакі, але ні ў якім разе не хацеў аслабляць сваіх саюзнікаў у ВКЛ з ліку шляхты. Гэта добра ілюструюць наступныя падзеі.

22 ліпеня Ю. С. Сапега пад Юрбаркам чарговы раз разбівае войска Агінскага. Літаральна праз пяць дзён пры ўдзеле караля ў Варшаве было заключана новае мірнае пагадненне [10, p. 28], але ўжо 14 жніўня шляхта на з'ездзе ў Вільні пад кіраўніцтвам М. Коцела ўхваліла акт аб зборы на 15 кастрычніка шляхецкага рушання пад Гародняй [25, p. 44]. Лідэры шляхты, Коцел, Агінскі, Пацей і Заранак, выслалі да караля віленскага канонніка Міхала Крыштапа Белазора з просьбай прысласць ў ВКЛ саксонскае войска для сумесных дзеянняў супраць Сапегаў [23, p. 269]. Пад Гародняй сабралася, па розных дадзеных, ад 10 да 20 тыс. шляхты. Сапегі, падцягнуўшы рэгулярнае войска і сваю шляхту, сталі табарам пад Пузевічамі каля Гародні. Наспявала бітва. Аднак умяшаўся Аўгуст II – ён даслаў у ВКЛ саксонскае войска на чале з Я. Флемінгам, якое заняло бок шляхты. У выніку 21 снежня 1698 г. было падпісана мірнае пагадненне (т. зв. «Гарадзенская пастанова») – Сапегі пагадзіліся на кэквацыю і на скарачэнне ў два разы колькасці літоўскага войска. Скарачэнне гэта адбылося адразу ж на месцы прытым даволі ганебным спосабам – харужыя ламалі праз калена свае харугвы і кідалі іх на зямлю [20, p. 23]. Замест уласнага войска ВКЛ атрымала на пастой саксонскае, быццам бы як гаранта міру. Паводле «Пастановы», М. Коцел абвяшчаўся генеральным палкоўнікам ВКЛ [1, c. 279], што азначала пачатак афармлення ў Княстве двоеўладдзя.

У хуткім часе Аўгуст II зноў пачынае збліжацца з Сапегамі, і тыя, карыстаючыся гэтым, парушаюць дамову. Замірэнне трывала нядоўга, і ў пачатку 1699 г. Аўгусту зноў давялося спрабаваць памірыць варагуючыя бакі. Але пры гэтым ён працягвае выкарыстоўваць кожны з бакоў для дасягнення ўласных мэтаў. З 1698 г. Аўгуст II пачынае рыхтаваць у саюзе з Расіяй і Даніяй вайну са Швецыяй. Перад ім стаяла задача канцэнтрацыі войскаў на ліфляндскай мя-

жы. А тым часам сойм, скліканы ў 1699 г., катэгарычна запатрабаваў вываду саксонскіх войскаў з Рэчы Паспалітай. Вось тады каралю і спатрэбіўся яго літоўскі «козыр». У гэты час у ВКЛ рэзка абвастрылася сітуацыя. А. Агінскі ўзбунтаваў частку войска. Але толькі пры знешняй дапамозе яго партыя магла разлічваць на перамогу. Таму, калі на сойме Карона патрабавала вываду саксонскіх войскаў, літоўская шляхта настойвала на адваротным [5, с. 226]. Гэта дазволіла Аўгусту захаваць свае атрады ў ВКЛ, сцягнуць сюды новыя сілы і распачаць наступ на шведскую Рыгу.

Каб уцягнуць у вайну і Рэч Паспалітую, Аўгуст II паспрабаваў падкупіць сенат, а таксама прапанаваў свае пасрэдніцкія паслугі Сапегам, за што тыя павінны былі даць згоду на вайну са Швецыяй. Што ўласна і было імі зроблена на сесіі сената ў маі 1700 г. [5, с. 227].

1 ліпеня 1700 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аўгуст II выдаў у Гародні універсал, у якім загадаў вялікаму гетману літоўскаму Казіміру Сапегу збіраць войска і ісці з ім у Ліфляндыю. Адразу ж пасля гэтага гетман выдаў у Гародні свой маніфест, у якім загадаў войску збірацца пад Гародняй. У жніўні 1700 г. частка літоўскага войска рушыла да Вільні, адкуль планавалася ісці на Рыгу [26, с. 86]. Адначасова на заклік Аўгуста II пад Ашмянамі з'язджалася паспалітае рушанне «для абароны межаў дзяржавы».

Аднак нельга разглядаюць 1 ліпеня 1700 г. у якасці дня ўступлення ВКЛ у Паўночную вайну. Па-першае, абодва маніфесты не былі да канца рэалізаваны. Па-другое, без зацвярджэння Соймам яны не мелі рэальнай сілы, былі, па сутнасці, незаконнымі. У ВКЛ ішла грамадзянская вайна, і ўсе арганізацыйныя захады былі выкарыстаны варагуючымі бакамі для кансалідацыі ўласных вайсковых сілаў («абарона дзяржавы» ад шведаў паслужыла толькі зручнай зачэпкай). Афіцыйнай пазіцыяй ВКЛ, як і ў цэлым Рэчы Паспалітай, быў нейтралітэт.

Летам 1700 г. у Ашмянскім павеце, пад Ліпнішкамі, ствараецца канфедэрацыя шляхты ВКЛ. Шэрагі апазіцыі Сапегам за гэты час значна пашырыліся, у першую чаргу за кошт Вішнявецкіх – Міхала (старасты пінскага) і Януша (маршалка надворнага). Вішнявецкія, да гэтага нейтральныя, перайшлі ў лагер апазіцыі пасля выпадку ў красавіку гэтага ж году, калі ў Вільні на вузкай вулачцы іх карэта сутыкнулася з карэтай Сапегаў. Адбылася бойка са страляніной, у выніку якой князі Міхал і Януш былі параненыя. Дваццацігадовага Міхала Вішнявецкага шляхта абрала генеральным палкоўнікам канфедэрацыі [25, р. 55]. Сакратаром канфедэрацыі стаў М. К. Белазор, у якога таксама былі асабістыя рахункі з Сапегамі – два гады таму вялікі гетман загадаў пакараць смерцю яго брата [15, р. 44].

Сапегі спрабавалі перашкодзіць зборам канфедэратаў. 15 кастрычніка Бенедыкт Сапега як генеральны палкоўнік Ашмянскага павету на чале невялікіх сілаў рэгулярнай арміі і шляхецкіх харугваў сваіх прыхільнікаў атакаваў пад Ашмянамі сілы «рэспубліканцаў» пад камандаваннем М. К. Коцела [14, р. 369]. Перамога дасталася сапяжынцам, але перашкодзіць намерам канфедэратаў яны не здолелі. Коцел адступіў пад Наваградак, дзе дачакаўся прыбыцця падмацавання ад Вішнявецкіх, якія прыйшлі з валашскімі харугвамі і пінскай шляхтай, і рушыў у напрамку Вільні. У дарозе да іх далучыўся Агінскі, які прывёў шляхту са Жмудзі [29, р. 60]. Вайсковая дапамога паступіла таксама ад С. К. Радзівіла, які памятаў пра «нойбургскія ўладанні». Шляхта ў паветах таксама збіралася на паспалітае рушанне, каб уліцца ў шэрагі канфедэратаў. Усяго сабралася 10–12 тыс. войска (па іншых дадзеных – 20 тыс.). Насустрач яму з Вільні выступіў вялікі гетман з 9-тысячным войскам.

18 лістапада 1700 г. пад Алькенікамі адбылася жорсткая шасцігадзінная бітва, падчас якой сілы Сапегаў былі ўшчэнт разбіты. Зыход бітвы вырашыў удар, нанесены Агінскім, які па лясах зайшоў у тыл вялікаму гетману [тамсама]. Сапегі выратаваліся ўцёкамі да Вільні. Аднак у палон трапіў Міхал Сапега, канюшы літоўскі. Нягледзячы на тое, што лідэры канфедэратаў гарантавалі яму жыццё, на наступны пасля бітвы дзень М. Сапега быў жорстка забіты – пасечаны на кавалкі шляхтай, якая напілася, святкуючы перамогу [20, р. 29–30]. Смерць сына вялікага гетмана зрабіла немагчымымі нават спробы замірэння. Сапегі, вымушаныя эміграваць з ВКЛ, прагнулі помсты.

24 лістапада 1700 г. у Алькеніках канфедэраты прынялі спецыяльную пастанову, якая пазбаўляла Сапегаў усіх дзяржаўных пасадаў, маёнткаў у ВКЛ і асуджала на выгнанне [23, р. 272]. Літоўскае войска было перададзена ў двухгадовае камандаванне М. Вішнявецкага. Коцел і Агінскі былі ўпаўнаважаны на працягу двух гадоў самастойна прызначаць і спаганяць падаткі. «Нойбургскае пытанне» вырашалася на карысць К. Радзівіла [27, р. 195–196].

Але кіраўнікі канфедэратаў гэтым не абмежаваліся і вырашылі вылучыць праграму шырокіх палітычных рэформаў, вынікам чаго стала прыняцце адпаведнай пастановы на з'ездзе ў Вільні. «Віленская пастанова» (датаваная таксама 24 лістападам 1700 г.) перавярнула ўсю ідэалогію барацьбы. Калі шляхта змагалася за пашырэнне сваіх правоў, то ў пастанове дэкларавалася неабходнасць устанаўлення абсалютнай улады, бо «манархізм» – умова магутнасці

дзяржавы. На той час такія погляды былі, безумоўна, прагрэсіўнымі. Паводле дакумента, прычынай таго, што Літва «падупала» і «ў межах курчыцца пачала», з'яўляецца яе унія з Польшчай, якая дала «нікчэмныя вольнасці» [25, р. 82]. Таму патрэбна звярнуцца да формы кіравання часоў Гедымінавічаў, Альгердавічаў і Ягайлавічаў. Трон павінен быў зрабіцца спадчынным, «liberum veto» адмянялася. Было пастаноўлена разарваць унію і перадаць усю паўнату ўлады вялікаму князю – Аўгусту II [25, р. 83; 26, р. 92].

Гісторыя ўзнікнення «Віленскай пастановы» з'яўляецца самым цьмяным і маладаследаваным эпізодам беларускай гісторыі мяжы XVII і XVIII стст. Пытанні выклікае час складання дакумента, месца яго падпісання і роля ў гэтай справе Аўгуста II. «Пастанова» настолькі разыходзілася з ранейшай праграмай шляхецкіх апазіцыянераў, якіх сучаснікі красамоўна называлі «рэспубліканцамі», што некаторыя даследчыкі нават лічылі, што гэта не што іншае, як правакацыя Сапегаў з мэтай абвінаваціць канфедэратаў перад палякамі у падтрымцы абсалютысцкіх планаў Аўгуста II. Але, як паказаў польскі гісторык Я. Сташэўскі, у Аўгуста II сапраўды існавала таемная дамова з правадырамі «рэспублíканцаў» па гэтаму пытанню [26, р. 88]. Атрымаўшы ліст ад Агінскага з паведамленнем пра перамогу пад Алькенікамі, кароль нават не палічыў патрэбным хаваць сваю радасць. Фрагмент ліста, які трапіў у рукі прымасу, заканчваўся словамі: «Шляхта сабралася, каб прывесці каралю довады вернасці і каб запэўніць, што выканае загады, якія ён ёй даў у мінулым» [тамсама]. Доўгі час заставаліся спрэчнымі месца і час стварэння дакумента. «Віленская пастанова» не магла быць падпісаная 24 лістапада 1700 г., бо ўсе асобы, якія паставілі пад ёй свае подпісы, знаходзіліся ў гэты дзень у Алькеніках, дзе займаліся прыняццем іншай пастановы. К. Піварскі лічыў, што дакумент быў складзены ў лютым 1701 г. у Біржах падчас побыту там Аўгуста II, які вёў перамовы з Пятром І. Сапраўды, на сустрэчу ў Біржах прыехалі таксама Агінскі, Заранак і Гружэўскі, якія там «нейкія незвычайныя і няслушныя падпісалі пункты, нешта наконт абсалютнага панавання» [23, р. 274]. Аднак, як давёў Я. Сташэўскі, «пастанова» была прынята на шляхецкім з'ездзе ў Вільні на пачатку мая 1701 г. Сведчанне гэтага было выяўлена ім ў архіве міністэрства замежных спраў Францыі сярод данясенняў французскіх рэзідэнтаў з Рэчы Паспалітай. Адно з іх утрымлівае апісанне прыняцця пастановы, якое адбывалася ў езуіцкім манастыры ў Вільні [26, р. 91]. Цікава, што большасць шляхты, сабранай на з'езд, выступіла супраць прыняцця дакумента, і лідэрам канфедэрацыі прыйшлося засядаць асобна, пад аховай войска.

Што тычыцца ролі Аўгуста II, то Сташэўскі лічыць яго галоўным ідэйным натхніцелем «Віленскай пастановы». Аўгуст II, які настойліва вывучаў гісторыю Рэчы Паспалітай (нават займаўся гэтым у вайсковым лагеры пад Рыгай), прыйшоў да высновы, што моцная каралеўская ўлада існавала ў Польшчы да таго часу, пакуль польскія каралі абапіраліся на тую незалежнасць, якую давала ім спадчынная ўлада ў ВКЛ. Адсюль імкненне Аўгуста II да вылучэння ў межах Рэчы Паспалітай спадчыннага ўладання для саксонскага дому, на якое ён мог бы абапірацца ў сваіх далейшых захадах у гэтым накірунку [26, р. 89]. Спачатку ён меў намер забая-ваць для Рэчы Паспалітай Малдавію і Валахію, ператварыўшы іх у такое ўладанне [5, с. 190]. Пасля заключэння міру з Турцыяй Аўгуст II плануе адваяваць ў шведаў Ліфляндыю, прычым у яго таемнай дамове з прадстаўніком ліфляндскай шляхты Р. Паткулем было прадугледжана, што правінцыя складзе спадчыннае ўладанне саксонскага дому [11, р. 54]. Выглядае на тое, што гэта былі толькі пабочныя праекты, а галоўнай мэтай Аўгуста было атрыманне (узнаўленне) абсалютнай спадчыннай улады ў ВКЛ. Рэалізаваць гэты план ён збіраўся, падтрымаўшы апазіцыйную Сапегам шляхту і магнатаў, у лідэраў якіх узяў адпаведныя абяцанні.

Такім чынам, «Віленская пастанова» ўяўляла сабой праграму палітычных рэформаў, якія ў выпадку іх ажыццяўлення вывелі б краіну з працяглага крызісу. Абсалютызм на той час быў прагрэсіўнай з'явай у параўнанні са «шляхецкімі вольнасцямі». Аднак занадта радыкальны характар «пастановы» выклікаў супрацьдзеянне шляхецкіх масаў ужо падчас яе прыняцця [26, р. 91], не кажучы ўжо пра тую буру, якую яна выклікала ў Польшчы. Сойм Рэчы Паспалітай у 1701 г. пад ціскам раз'юшаных палякаў прыняў рашэнне спаліць «пастанову» на варшаўскім рынку. Да таго ж Аўгуста II напаткала няўдача ў вайне са Швецыяй, як і яго галоўнага саюзніка Пятра I, разбітага пад Нарвай. Карл XII рыхтаваў інтэрвенцыю ў Рэч Паспалітую. Аднак нельга сказаць, што «Віленская пастанова» была цалкам пахаваная і не пакінула па сабе ніякага следу. Паказальна, што менавіта з гэтага часу літоўскія канфедэраты выступаюць як «Рэч Паспалітая Літоўская» (вяртанне тэрміну XVI ст.). М. Белазор стаў яе афіцыйным рэзідэнтам пры Аўгусце II [15, р. 55]. Пазней у такім самым статусе ён будзе высланы ў Маскву. З'езды, пры дапамозе якіх канфедэраты кіравалі Княствам, моцна нагадваюць асобны літоўскі сойм (паслы абіраліся на павятовых сойміках). Больш таго, «Рэч Паспалітая Літоўская» хутка выявіла сваю сепара-

тысцкую сутнасць, павёўшы самастойную знешнюю палітыку, што супярэчыла ўмовам уніі з Каронай.

Алькеніцкая бітва не паклала канец грамадзянскай вайне. Асноўныя ўладанні Сапегаў знаходзіліся ва Усходняй Беларусі. Сапегі раздаюць сялянам зброю (шляхта, спустошаючы іх маёнткі, пераносіла сваю нянавісць на сялян), наймаюць на службу украінскіх казакаў-дэзерціраў з расійскага войска. Акрамя таго, ў Беларусь прыбылі 1500 украінскіх казакаў-паўстанцаў Сямёна Палея, з якім К. Сапега падтрымліваў кантакты яшчэ з 1693 г. [22, р. 115, 132]. Казакаў ахвотна прымалі паўстаўшыя сяляне ў якасці камандзіраў атрадаў. Сапяжынская адміністрацыя заахвочвала фармаванне партызанскіх групаў не толькі ў сваіх, але і ў шляхецкіх уладаннях. У выніку ў 1700–1701 гг. у Падняпроўі ўзнік магутны сялянскі рух на чале з сапяжынскімі камандзірамі Юрэвічам і Більдзюкевічам, якія павялі зацятую барацьбу са шляхецкімі харугвамі, абапіраючыся на Стары Быхаў. Агульная колькасць паўстанцаў даходзіла да 40 тыс. чалавек [22, р. 132]. «Магілёўская хроніка» пад 1701 г. фіксуе сутыкненні сапяжынцаў з канфедэратамі пад Новым Быхавам, у Гайшыне і пад Магілёвам, на Буйніцкім полі [6, с. 252–253]. А 26 ліпеня 1701 г. пад Дуброўнай адбылася сапраўдная бітва сапяжынскіх сялянаў са шляхецкімі харугвамі Л. Пацея, у якой загінулі каля дзвюх тысяч сялян і паўтысячы конніцы [6, с. 252; 22, р. 133].

Грамадзянская вайна 1696–1702 гг., у якую вылілася супрацьстаянне Сапегаў і шляхецкай апазіцыі, была фактычна завершана. У бітве пад Алькенікамі Сапегі пацярпелі сакрушальнае паражэнне. Пасля яе баявыя дзеянні адбываліся толькі ў Падняпроўі. Але канчанткова падавіць гэты лакальны ачаг супраціўлення да 1702 г. канфедэратам так і не ўдалося, паколькі сапяжынцы працягвалі ўтрымліваць за сабой Стары Быхаў. Вырата-ваць Сапегаў, якія не жадалі мірыцца, магло толькі замежнае ўмяшальніцтва. Якраз гэта і паслужыла прычынай таго, што пераможаныя літоўскія магнаты звярнуліся па дапамогу да шведскага караля Карла XII, які на той момант стаяў з войскам у Курляндыі, на мяжы ВКЛ, і рыхтаваў паход у Рэч Паспалітую з мэтай дэтранізацыі Аўгуста II [2, с. 9–10]. У адказ на шведскую інтэрвенцыю канфедэраты ў канцы 1701 г. выслалі пасольства ў Маскву і 3 красавіка 1702 г. падпісалі саюзную дамову паміж ВКЛ і Расіяй, паводле якой Вялікае княства афіцыйна ўступіла ў Паўночную вайну [8, с. 368–369]. Дэфакта падпісанне такой дамовы азначала разрыў уніі з Польшчай. Дзве дзяржавы заключылі супраць Швецыі абарончы і наступальны саюз. Гэта сведчыла пра тое, што з дадзенага моманту ўзброенае супрацьстаянне ў ВКЛ пераходзіць у іншую плоскасць і цалкам упісваецца ў кантэкст Паўночнай вайны.

Алькеніцкая бітва не проста паклала канец гегемоніі Сапегаў у ВКЛ. Фактычна яна завяршае цэлую эпоху дамінавання ў Княстве пэўнага магнацкага дому. На змену Сапегам не прыйшоў нейкі іншы род, настолькі ж магутны і заможны. У далейшым, пасля заканчэння Паўночнай вайны і канчатковага паражэння Сапегаў, найвышэйшыя пасады ў Княстве займае адразу некалькі сярэдніх і дробных магнацкіх фамілій, ніводная з якіх не мела ўжо такога ўплыву і амбіцый. Адпаведна, перажывае практычна поўны заняпад ідэя дасягнення Вялікім княствам ранейшай незалежнасці. Спрычынілася да гэтага і рэалізацыя праграмы ўраўнавання правоў літоўскай шляхты з правамі кароннай. Важна, праўда, адзначыць, што за перыяд барацьбы з Сапегамі ў ідэалогіі «рэспубліканцаў» з'явіліся новыя інтэнцыі, выражаныя ў «Віленскай пастанове», якія, аднак, не сталі дамінуючымі, хаця і аказалі істотны ўплыў на выпрацоўку далейшай палітычнай лініі «Рэчы Паспалітай Літоўскай». Паўночная вайна канчаткова пахавае ідэю поўнай незалежнасці ВКЛ як у магнацкім, так і ў шляхецкім яе варыянце.

## Літаратура

1. Акты издаваемые Виленскою археографическою коммиссиею. – Т. IV. Акты Брестского гродского суда. – Вильна: В типографии Губернского Правления, 1870. – 615 с.

2. Записка или рассказ Мазовецкого воеводы о событиях его жизни со времени его выхода из родительского дома, написанный им по требованию его семьи 22 января 1734 года /Пуб. С. М. Горяинова // Журнал императорского русского военно-исторического общества. – 1910. – Кн. 2. – С. 7–28.

3. Корб И. Г. Дневник путешествия в Московию (1698 и 1699 гг.)/ Пер. и прим. А. И. Малеина. – СПб.: Издание А. С. Суворина, 1906. – 294 с.

4. Королюк В. Д. Избрание Августа II на польский престол и русская дипломатия // Ученые записки института славяноведения. – 1951. – Т. III. – С. 176–219.

5. Королюк В. Д. Речь Посполитая и подготовка Северной войны // Ученые записки института славяноведения. – 1951. – Т. IV. – С. 190–236.

6. Полное собрание русских летописей. Т. 35. Летописи белорусско-литовские. – М.: Наука, 1980. – 306 с.

7. Письма и бумаги императора Петра Великого. – СПб.: Государственная типография, 1887. – Т. I. (1688–1701). – 975 с.

8. Письма и бумаги императора Петра Великого. – СПб.: Государственная типография, 1889. – Т. II. (1702–1703). – XXIV+722+LXII с.

9. Рахуба А. Палітычныя групоўкі ў ВКЛ // Спадчына. – 2000. – № 5–6. – С. 32–46.

10. Слесарунас Г. Феадальная вайна 1697–1702 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мн.: «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 2003. – Т. 6. – Кн. 2. – С. 27–28.

11. Тарле Е. В. Избранные сочинения академика Е. В. Тарле: В 4 т. – Ростов н/Д.: Феникс, 1994. – Т. 3. Северная война и шведское нашествие на Россию; Русский флот и внешняя политика Петра I. – 672 с.

12. Anysik Z., Stroynowski A. Radziwiłłowie w epoce saskiej // Acta Universitatis Lodziensis. Folia historica. – № 33. Historia nowożytna. – 1989. – P. 95–132.

13. Bezkrólewie po Janie III Sobieskim. Dzieło Bizardiera/ Przetłómaczone na język polski i objaśnione przypiskami przez Juljana Bartoszewicza. – Wilno: Nakładem księgarni pod firmą Rubena Rafałowicza, 1853. – XXV+215 p.

14. Dom Sapieżyński/ Opracował Eustachy Sapieha. – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 1995. – 805 p.

15. Jasienica P. Rzeczpospolita obojga narodów. T. III. Dzieje agonii. – Warszawa: Czytelnik, 1999. – 549 p.

16. Konopczyński W. Dzieje Polski nowożytnej. – Warszawa: Skład główny u Gebethnera i Wolffa, 1936. – T. II. 1648–1795. – 460 p.

17. Konopczyński W. Polska a Szwecja od pokoju Oliwskiego do upadku Rzeczypospolitej 1600 – 1795. – Warszawa: Wydawnictwo Institutu Popierania Polskiej Twórczości Naukowej p.n. Kasa Mianowskiego, 1924. – 390 p.

18. Morawski K.M. Pierwsze kroki Augusta Mocnego w Polsce // Przegląd współczesny. – 1939. – № 1. – P. 34–55.

19. Niezabitowski S. Dzienniki, 1695–1700/ Opracował, przygotował do druku i wstępem opatrzył Alojzy Sajkowski. – Poznań: Wydawnictwo naukowe UAM, 1998. – 375 p.

20. Otwinowski E. Dzieje Polski pod panowaniem Augusta II od roku 1696–1728. – Kraków: Nakładem i drukiem Józefa Czecha, 1849. – 363 p.

21. Pamiętniki Krzysztofa Zawiszy, wojewody mińskiego (1666–1721)/ Wydane z oryginalnego rękopismu i opatrzone prypiskami przez Juliana Bartoszewicza. – Warszawa: Nakładem Jana Zawiszy, potomka Wojewody, 1862. – LXIII+427 p.

22. Perdenia J. Stanowisko Rzeczypospolitej szlacheckiej wobec sprawy Ukrainy na przełomie XVII–XVIII w. // Polska Akademia nauk – Oddział w Krakowie. Prace komisji nauk historycznych. – 1963. – № 8. – 284 p.

23. Piwarski K. Opozycja litewska pod koniec XVII wieku // Pamiętnik V powszechnego zjazdu historyków polskich w Warszawie 28 listopada do 4 grudnia 1930 r. – Lwów: Nakładem Polskiego Towarzystwa historycznego, 1930. – Z. I. Referaty. – P. 259–277.

24. Rachuba A. Litwa wobec projektu zwołania sejmu konnego w 1695 r. i walki Sapiehów z biskupem Brzostowskim // Zapiski Historyczne. – T. LI. – Z. 1. – 1986. – P. 63–82.

25. Sierzputowski T. Pierwsza próba reformy politycznej w Polsce. – Warszawa: Jan Fiszer, 1905. – 95 p.

26. Staszewski J. «Postanowienie Wileńskie» z 1701 r. i jego wpływ na unię polsko-litewską w czasach saskich // Zapiski Historyczne. – 1986. – T. LI. – Z. 1. – P. 83–96.

27. Szujski J. Dzieje Polski // Dzieła Józefa Szujskiego. Wydanie zbiorowe. – Ser. II. –T. IV Królowie wolno obrani. – Część II. – W Krakowie.: Nakładem rodziny Józefa Szujskiego, 1894. – 837 p.

28. Volumina legum. T. IV. – Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. – 363+XV p.

29. Wasilewski T. Walka o zrównanie praw szlachty litewskiej z koroną od unii Lubelskiej do początku XVIII wieku // Zapiski Historyczne. – 1986. – T. LI. – Z. 1. – P. 45–62.

30. Wojtasik J. Walka Augusta II z obozem kontystowsko-prymasowskim w pierwszym roku panowania (1697–98) // Przegląd historyczny. – 1969. – T. LX. – Z. 1. – P. 24–44.